ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1983
24
ЛІСТАПАДА
ЧАЦВЕР
№ 32 (1408)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

"Беларускі універсітэт"
## тэлетайп
• Учора • Сёння • Заўтра •

### РЭКТАРАТ І ПАРТКОМ

на сумесным пасяджэнні разгледзелі пытанне «Аб стане арганізацыйнай і палітыка-выхаваўчай работы ў інтэрнатах універсітэта». З дакладамі выступілі прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай частцы У. І. Сілін і член парткома В. А. Прокашава.

На пасяджэнні абмеркаваны таксама вынікі работы студэнтаў у будаўнічых і сельскагаспадарчых атрадах у 1983 годзе і задачы па падрыхтоўцы да летняга працоўнага семестра 1984 года.

Н. АЛЕГАВА,
наш кар.

### ТРЫО «МЕРЫДЫЯН»

выступіць перад студэнтамі, выкладчыкамі і супрацоўнікамі БДУ імя У. І. Леніна. Сустрэча арганізавана студэнцкім прафкомам універсітэта сумесна з Белдзяржфілармоніяй у рамках фестывалю «Беларуская музычная восень». Разам з лаўрэатам Усесаюзнага конкурсу маладых выканаўцаў савецкай песні ў сустрэчы прыме ўдзел заслужаны дзеяч мастацтваў РСФСР, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола і Дзяржаўнай прэміі СССР кампазітар М. Тарывердзіеў.

З. АЛЯКСАНДРАВА,
наш кар.

### ЗНАЙСЦІ ПАТРЭБНУЮ КНІГУ

мінулых гадоў выдання вам заўсёды дапамогуць букіністы Мінска. Для гэтага неабходна толькі запоўніць паштоўку на патрэбнае вам выданне і пакінуць яе ў прадаўцоў-кансультантаў. Заказы прымаюцца ва ўсіх кніжных магазінах сталіцы на грамадска-палітычную, навукова-тэхнічную, вучэбна-метадычную і іншую спецыяльную літаратуру, энцыклапедычныя выданні галіновага характару, кнігі па мастацтву, архітэктуры, будаўніцтву (за выключэннем кніг павышанага попыту).

На працягу года букіністы будуць весці пошук патрэбных вам кніг і выканаюць заказы ў адпаведнасці з паступленнем гэтых выданняў у букіністычныя магазіны.

С. ДАШЧЫНСКАЯ,
рэдактар аддзела прапаганды кнігі Мінаблкнігагандлю.

### ЛЕКЦЫЯ

на тэму «Савецка-амерыканскія адносіны: стан і перспектывы» прайшла ў актавай зале універсітэта. Перад прысутнымі выступіў лектар С. П. Мясаедаў (Масква) і адказаў на зададзеныя пытанні.

Л. МАРЦЫОНКА.

## Гнеўнае асуджэнне палітыкі ЗША

НА ДРУГІМ курсе механіка-матэматычнага факультэта адбыўся мітынг «Рукі прэч ад Грэнады!». У ім прынялі ўдзел студэнты з Нікарагуа і В'етнама.

Выступіўшыя на мітынгу адзначылі, што бандыцкі напад ЗША на Грэнаду — яркае сведчанне палітыкі ваеннага авантурызму, якая праводзіцца адміністрацыяй Рэйгана. Гэта — ваенны акт, які нясе сур'ёзную пагрозу міру і бяспецы народаў. Прысутныя гнеўна асудзілі нахабную інтэрвенцыю ЗША на Грэнадзе і выказалі сваю гарачую салідарнасць з народам, які змагаецца супраць агрэсара. Камсамольцы пастанавілі правесці суботнік і пералічыць свой заробак у Фонд міру.

В. ЮР'ЕЎ.

## XXX СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРНАЯ КАМСАМОЛЬСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ УНІВЕРСІТЭТА



ПРАЙШЛА справаздачна-выбарная камсамольская канферэнцыя універсітэта. Са справаздачным дакладам выступіў сакратар камітэта камсамола А. КАЗУЛІН, аб дзейнасці штаба «Камсамольскага пражэктара» паведаміў яго старшыня А. ШЫБУТ.

У спрэчках па двух дакладах выступілі сакратар камітэта камсамола мехмата В. ЖУК, першы сакратар Мінскага АК ЛКСМБ Л. ХМЯЛЕЎСКАЯ, ветэран партыі, былы выкладчык юрфака Я. ПЛЮТА, студэнт гістфака А. ГУТАВЕЦ, студэнт з Йемена МАСАЙД ЗЕЙФУЛА, студэнтка ФПМ А. МІКУЛА, студэнтка мехмата Г. КРАЎЧАНКА, студэнт з Грэцыі ВАСІЛІУ ДЗІМІТРЫС, студэнт фізфака С. ДАБРЫНЕЎСКІ, супрацоўнік СКТБ з ВВ А. ГАНЧАРОЎ, студэнтка гістфака Л. КАЧАН, загадчык падрыхтоўчага аддзялення А. СЛУКА, студэнт геафака А. ЯРОТАЎ, дацэнт кафедры фізікі паўправаднікоў А. ПАТРЫН, сакратар парткома універсітэта М. ДЗЯМЧУК, першы сакратар ЦК ЛКСМБ Н. МАЗАЙ. Праведзены выбары новага саставу камітэта камсамола універсітэта, штаба «Камсамольскага пражэктара».

Адразу пасля канферэнцыі адбыўся пленум, на якім выбрана бюро камітэта камсамола універсітэта. Сакратаром камітэта камсамола і членам бюро выбраны А. КАЗУЛІН.

НА ЗДЫМКАХ: уважліва слухаюць дэлегаты канферэнцыі справаздачны даклад камітэта камсамола; на трыбуне — сакратар камітэта камсамола А. КАЗУЛІН.



### СВЯТА НАШЫХ СЯБРОЎ

## «Карнавал у ГДР»

11 ДНЯ 11 месяца ў 11 гадзін 11 мінут кожны год у ГДР пачынаецца карнавальны час. Працягваецца ён да лютага. Гэта старая-старая традыцыя нямецкага народа. Са смехам правесці стары і са смехам сустрэць новы год лічыцца абавязковым. У гэты час ва ўсіх кутках ГДР праходзяць карнавалы і карнавальныя шэсці. Народ весяліцца, жартуе, смяецца...

Пра ўсё гэта даведаліся савецкія і замежныя студэнты ад сваіх сяброў з ГДР. 11 лістапада ў сёмым інтэрнаце прайшоў вечар «Карнавал у ГДР». Яго падрыхтавалі студэнты-філолагі, будучыя выкладчыкі рускай мовы, з Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі, якія праходзяць у нашым універсітэце стажыроўку.

Актавая зала святочна ўпрыгожана. Збіраюцца студэнты. Нямецкія сябры падрыхтавалі цікавыя, своеасаблівыя карнавальныя касцюмы. Загучала музыка, і карнавал пачаўся. Танцы чаргаваліся з расказамі аб традыцыях фестывалю ў ГДР, з вясёлымі гульнямі. Неяк вельмі хутка праляцелі тры гадзіны. Добра, калі б часцей праходзілі такія мерапрыемствы. Яны даюць магчымасць пазнаёміцца з традыцыямі тых краін, адкуль вучацца ў нас студэнты. Рабяты з ГДР падказалі цікавую форму работы. Хочацца, каб гэтым зацікавіліся ў студсаветах інтэрнатаў, камітэце камсамола.

С. ГОГАЛЬ,
студэнтка факультэта журналістыкі.

### НАШ КОНКУРС

## ЛЕПШЫ МАТЭРЫЯЛ

РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ праводзіць конкурс на лепшы матэрыял, змешчаны ў «Беларускім універсітэце». За верасень-кастрычнік прызнаны лепшымі публікацыі загадчыка кафедры агульнага і славянскага мовазнаўства А. Супруна «Зрабіць усё, што можаш» (№ 26), дэкана факультэта радыёфізікі і электронікі А. Шырокава «Агонь запальваецца ад агню» (№ 28), выпускніка факультэта радыёфізікі і электронікі Ю. Варатніцкага «Дзякуй табе, універсітэт» (№ 24).

Віншуем лаўрэатаў конкурсу!

**У рашэннях лістападаўскага (1982 г.) і чэрвеньскага (1983 г.) Пленумаў ЦК КПСС, а таксама ў пастанове ЦК КПСС «Аб удасканаленні арганізацыі, практыкі падвядзення вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва і заахвочвання яго пераможцаў» пастаўлены задачы па павышэнню дзейснасці сацыялістычнага спаборніцтва ў вырашэнні сацыяльна-эканамічных задач, развіцці працоўнай актыўнасці яго ўдзельнікаў, накіраванай на дасягненне высокіх канчатковых рэзультатаў.**

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

# НА КРЫЛАХ СПАБОРНІЦТВА

ПАРТЫЙНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ БДУ імя У. І. Леніна нацэльвае шматтысячны калектыў студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў на далейшае павышэнне якасці выкладання, рост навуковага патэнцыялу, умацаванне творчых сувязей з вытворчасцю і ўдасканаленне ідэйна-выхаваўчай работы. Зараз намаганні нашага калектыву накіраваны на выкананне прынятых сацыялістычных абавязацельстваў, якія намячаюць новыя рубяжы па ўсіх асноўных паказчыках.

Так, напрыклад, чакаецца атрыманне эканамічнага эфекту ад укаранення навукова-даследчых работ не менш як 15 млн. рублёў, у тым ліку 1,5 млн. рублёў па работах, звязаных з рэалізацыяй Харчовай праграмы. Супрацоўнікамі і аспірантамі будзе абаронена не менш як 95 доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый, будуць выкананы планы прыёму і выпуску спецыялістаў па ўсіх формах навучання.

Калектыў універсітэта ў цэлым, а таксама калектывы НДІ ПФП, СКТБ з вопытнай вытворчасцю, выдавецтва БДУ неаднаразова заваёўвалі прызавыя месцы ва Усесаюзным сацыялістычным спаборніцтве устаноў МінВНУ СССР. Гэтыя поспехі дасягнуты дзякуючы актыўнаму ўздзеянню партыйнай арганізацыі універсітэта на ход спаборніцтва, авангарднай ролі камуністаў і прафсаюзнага актыву ў яго арганізацыі. У практыку работы партыйных органаў трывала ўвайшлі пытанні арганізацыі спаборніцтва і яго далейшага ўдасканалення. Так, напрыклад, у бягучым годзе рашэннем парткома створана агульнауніверсітэцкая камісія па арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва. Мэта яе — каардынацыя работы падраздзяленняў і аказанне ім метадычнай дапамогі ў пытаннях арганізацыі спаборніцтва.

У апошнія гады павысілася роля сацыялістычных абавязацельстваў у мабілізацыі калектываў падраздзяленняў на дасягненне высокіх канчатковых вынікаў. Гэта было дасягнута дзякуючы існуючай практыцы абароны калектывамі падраздзяленняў прымаемых абавязацельстваў, прычым апанентамі ў даным выпадку выступаюць прадстаўнікі парткома, прафкома і іншых падраздзяленняў і служб універсітэта.

Вопыт паказвае, што актыўная пазіцыя партыйных бюро, партгрупоргаў і ўсяго партыйнага актыву, іх высокая патрабавальнасць дастаткова хутка прыносяць свае рэзультаты. Гэта пераканаўча відаць на прыкладзе партыйных арганізацый факультэтаў прыкладной матэматыкі і механіка-матэматычнага, якія дзякуючы вялікай арганізатарскай рабоце іх партыйных бюро ўпершыню выйшлі на прызавыя месцы па выніках сацспаборніцтва сярод факультэтаў універсітэта ў 1982 годзе. Заслугоўвае ўвагі вопыт СКТБ з вопытнай вытворчасцю па арганізацыі конкурсаў «Лепшы па прафесіі», у тым ліку «Лепшы канструктар», «Лепшы тэхнолаг» і інш.

На фізічным факультэце ўжо тры гады дзейнічае «Палажэнне аб конкурсе на лепшую вучэбную лабараторыю». Гэта дазволіла факультэту не толькі аблегчыць падвядзенне вынікаў па прымяненню ТСН, але і стымулюе кафедры на ўдасканаленне вучэбнага працэсу.

Разам з тым партыйныя арганізацыі шэрагу падраздзяленняў праяўляюць безыніцыятыўнасць у пошуках новых форм спаборніцтва. Інакш чым растлумачыць той факт, што яшчэ так слаба развіты дагаворныя формы сацыялістычнага спаборніцтва, недастаткова праводзіцца конкурсаў на званне «Лепшы па прафесіі», ні на адным факультэце не арганізавана на належным узроўні спаборніцтва вучэбна-дапаможнага персаналу.

Назапашаны нашай партыйнай арганізацыяй вопыт і яе творчы патэнцыял павінны паўней выкарыстоўвацца для ўзмацнення ролі сацыялістычнага спаборніцтва і яго ўздзеяння на павышэнне эфектыўнасці вучэбна-выхаваўчай работы, развіццё навуковых даследаванняў і ўмацаванне сувязей з вытворчасцю.

**Г. МАЦВЕЕЎ,**
**намеснік старшыні агульнауніверсітэцкай камісіі па сацыялістычнаму спаборніцтву.**

# ПЫТАЙЦЕСЯ — АДКАЗВАЕМ

**Студэнты біялагічнага факультэта цікавіліся, якія рэчы яны могуць атрымаць у карыстанне ў каменданта інтэрната. На гэтае пытанне па просьбе члена штаба «КП» універсітэта І. Мамедава адказвае в. а. дырэктара студгарадка БДУ імя У. І. Леніна Г. Ф. Савянкоў.**

— Кожны жыхар інтэрната мае права атрымаць у часовае карыстанне ложак, пасцельныя рэчы (матрац, коўдру, падушку, дзве прасціны, навалачку, пакрывала), крэсла і тумбачку. Акрамя гэтага, на кожны пакой выдаюцца стол, радыёдынамік, настольная лямпа, графін з наборам шклянак, шторы, чайнік, сметніца. Камендант інтэрната забяспечвае бытавыя пакоі электрапрасамі, тазікамі і венікамі. Падрабязную інфармацыю па гэтаму пытанню можна атрымаць у кнізе У. М. Яцкевіча «Правы і абавязкі студэнтаў» (Выдавецтва «Вышэйшая школа». 1980 г.).



**БІБЛІЯТЭКА універсітэта ўжо некалькі гадоў выкарыстоўвае прагрэсіўную форму абслугоўвання чытачоў — калектыўную, калі неабходныя вучэбныя дапаможнікі выдаюцца адразу ўсім студэнтам групы. Усе групы ўжо атрымалі літаратуру.**

**Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.**

СЛОВА ДА ПЕРШАКУРСНІКА

# «Працуйце на поўную сілу»

ЦІКАВІЦЦА ХІМІЯЙ я пачала яшчэ ў сёмым класе: кожны ўрок прыносіў мне нешта новае, захапляючае, непаўторнае. І калі ў дзевятым класе паявілася магчымасць займацца ў школе «юных хімікаў», я пайшла, не задумваючыся. Вы не ўяўляеце, з якой радасцю я прыязджала на ўрокі. І таму пасля дзесятага класа я не стаяла на раздарожжы: куды пайсці вучыцца? Прафесія была абрана даўно: паступіла на вытворчы паток хімічнага факультэта. І адразу ж на першым курсе пачала займацца навуковай работай. Лічу, што гэта вельмі важна. І табе, сябар-першакурснік, раю таксама запісацца ў навуковы гурток, і чым хутчэй, тым лепш. Тут ты навучышся не толькі самастойна працаваць, правільна арыентавацца ў моры літаратуры, хутка выбіраць найбольш патрэбную, але і свабодна трымацца перад аўдыторыяй.

Кіраўніком маёй вытворчай практыкі і дыпломнай работы была старшы інжынер ВА «Інтэграл» Тамара Георгіеўна Драздова, якая таксама закончыла хімічны факультэт і ўжо трынаццаць гадоў працуе ў аб'яднанні. Сумесная работа з чалавекам, які добра ведае сваю справу, дапамагла мне яшчэ больш палюбіць сваю будучую прафесію, упэўніцца ў правільнасці яе выбару.

Першакурснік! Не будзь пасіўным, займайся грамадскай работай. Карыстайся ўсімі тымі прывілеямі, якія дае табе вучоба ў БДУ — флагмане вышэйшай школы рэспублікі.

**Алена ГАЙДУК,**
**выпускніца хімічнага факультэта.**

# АДКРЫЦЦЁ АЛІМПІЯДЫ

ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ адбылося ўрачыстае адкрыццё трэцяга тура Усесаюзнай алімпіяды «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс» па праграміраванню і электронна - вылічальных машынах.

Ад імя Рэспубліканскага аргкамітэта алімпіяды з прывітаннем да ўдзельнікаў звярнуўся рэктар БДУ імя У. І. Леніна акадэмік АН БССР Л. І. Кісялеўскі.

Алімпіяда «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс» з'яўляецца важнейшым звяном у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў. Яна павышае інтарэс да навукі, актыўнасць у вучобе, дапамагае выяўляць найбольш таленавітых і падрыхтаваных студэнтаў.

Восемдзесят тры мацнейшыя студэнты з дваццаці дзевяці вышэйшых навучальных устаноў краіны прыбылі ў наш універсітэт для ўдзелу ў цікавым творчым спаборніцтве. На працягу трох дзён удзельнікі будуць спаборнічаць ва ўменні выкарыстоўваць набытыя веды. Поспехаў вам, студэнты!

**А. НІКІЦЕНКА,**
**намеснік старшыні савета па НДРС.**

# МЫ З ХОРАМ НА МОРЫ

АЛЕ Ж ЯК БЫЛО ХОРАША! Колькі часу прайшло, а перад вачамі, толькі задумайся, гэтыя зрэзлівыя берагі — то пустыя, то пакрытыя лесам, бягучыя да іх марскія хвалі; дзесьці там, за лесам, пераблытаныя пратокі паміж незлічонымі азёрамі з вадой, такой празрыстай, што, здаецца, сама звініць, не трэба нават вяслом кратаць. Ці бачацца раптам таўшчэзныя сцены Крамля і чуецца посвіст брытанскіх ядраў, рассякаючых паветра, глухі грукат далёкіх карабельных гармат і аглушальны трэск ад сутыкнення ядра са сцяной: ядро ўшчэнт, а сцяне хоць бы што! Ужо болей за сто год тым падзеям!

Прычына такіх успамінаў — цудоўная турысцкая паездка, якая адбылася сёлета ва ўдзельнікаў хору народнай песні, выкладчыкаў і супрацоўнікаў Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна. Але ж паездка як паездка: здаецца, што тут асаблівага — купіў пуцёўку, ды і паехаў. Можаш нават слайдаў нарабіць на памяць.

Ды ніякія слайды не змогуць перадаць той настрой сярод удзельнікаў, тую ўзнёсласць, якія адпавядалі абставінам: падарожнічала не проста група аматараў падарожжаў, а людзі, якія хацелі на далёкіх Салавецкіх астравах хаця б крышачку — у меру сваіх здольнасцей — падзяліцца сваёй любоўю да народнай песні, перадаць прыгажосць беларускага спеву. Можа таму сярод Белага мора на палубе белага цеплахода ўсю белую ноч напралёт (такога супастаўлення «белага» не было нават у «Песняроў»!) перакрывала гудзенне рухавікоў задорнае беларускае «Выдзелывала, выгаварывала...» І вось ужо паўтараецца яно з рускім, латышскім, эстонскім акцэнтам — падхопліваюць, пяюць, танцуюць усе турысты на судне. Днём пры сустрэчы пытаюцца: «А сёння ўвечары вы будзеце выступаць?» І няхай не зусім афіцыйнай была жартоўная грамата, якую атрымаў хор ад каманды цеплахода, бо подпіс і пячатка на ёй былі ад марскога цара Нептуна, але дадзена была яна ад усяго сэрца, як сімвал удзячнасці ад усіх, хто нас чуў. Гэта вось і даражэй за ўсё ў памяці. Паболей бы такіх падарожжаў!

**В. НАВУМЕНКА,**
**удзельнік хору.**
Фота **В. Асташонка.**



● ПРАБЛЕМНЫ РЭПАРТАЖ ●

# ЗОРНЫЯ ПАХОДЫ ПАВІННЫ БЫЦЬ ЗОРНЫМІ

ЛІСА МЫШКАВАЛА: падскоквала на месцы, прыціскалася сваёй вострай мордачкай да зямлі, разграбала мышыныя хады. Слых у яе востры: паварушыцца мышаня ў норцы — драпежніца навострыць вушы. Ціхенька піскне небарака — і толькі хруснуць костачкі на лісіных зубах. Мы не паспелі добра разгледзець рыжую, як яна ўскінула галаву, хвіліну ўзіралася ў нас і шыбанула наўцёкі. «Эх, фотаружжо б сюды», — толькі і падумаў я, праводзячы поглядам прыгажуню.

Віцю Бунце — майму спадарожніку і камандзіру нашага зорнага паходу па месцах баявой і працоўнай славы — было не да драпежніцы: мяркуючы па карце, група даўно павінна была выйсці на Расонку. Цямнела, а рэчка не паказвалася. Вось і вырваліся мы ўдваіх наперад, каб пашукаць яе, прыгледзець месца для начоўкі.





— А вунь, здаецца, і ёсць Расонка,— перарваў мае роздумы Бунта.

За невялічкім полем віднеліся зараснікі кустоў, шэрай вольхі. Прычым, раслі яны не роўнай сцяной, а звілістай стужкай — куды Расонка паверне, туды і зараснікі. Здавалася, рачулка захуталася ў зімовае футра і, задаволеная яго цеплынёй, шпарка несла ў сваіх вузкіх берагах ваду з самога возера Нешчарды.

Мінут праз дзесяць ля Расонкі ўжо свяцілася вогнішча, чуўся вясёлы гоман юнакоў і дзяўчат. Яшчэ сёння раніцай многія з іх упершыню ўбачылі адзін аднаго, а цяпер ужо нічога не засталося ад той скаванасці, напружанасці першых мінут знаёмства. У паходзе знаёмства людзей заўсёды праходзіць намнога хутчэй. Тут і характары раскрываюцца больш рэльефна: чалавек увесь час на тваіх вачах, ты бачыш, як ён мые засаленыя катлы, як хлеб дзеліць, як адносіцца да працы. Усё відаць — і ў гэтым адна з асалод вандровак.

Маршрут у нас праходзіў па цікавых, гераічных мясцінах — па былой партызанскай зоне. Пачынаўся з вёскі Сяляўшчына Расонскага раёна, потым — Себежскі раён Пскоўскай вобласці. Апошнія два дні зноў ішлі па Беларусі — Верхнядзвінскім раёне. Месцы сапраўды гераічныя — першы партызанскі атрад Сяргеева (Сяргея Майсеенкі) быў арганізаваны ўжо ў кастрычніку 1941 года, у гэтых лясах пачынаў баявую дзейнасць П. М. Машэраў, у 1944 годзе пяць месяцаў, да пачатку аперацыі «Баграціён», праходзіла тут лінія абароны.

«...НЕМЦЫ паявіліся нечакана. Вялізная, доўгая, як змяя, калона. За Чайкамі калона раздвойвалася: частка лыжнікаў кралася па ільду замёрзшага возера, астатнія з артылерыяй пачалі абгінаць возера збоку. Што рабіць? У галаве Георгія Фёдаравіча Турлука пульсавала думка: як папярэдзіць кіраўніцтва партызанскай зоны аб нашэсці карнікаў? З групай партызан ён вяртаўся з баявога задання. Планавалі адпачыць у Чайках, але тут ужо гаспадарылі фашысты. Што рабіць? Абагнаць гітлераўцаў нельга — яны рухаюцца па дарозе, у лесе ж па пояс снегу. І камісар прымае адзіна правільнае рашэнне: даць бой.

— Агонь! — партызаны размясціліся на крутым схіле, адкуль чорныя нямецкія ланцугі былі відаць, як на далоні. Першы ж залп разарваў гэтыя ланцугі і паклаў іх на лёд.

— Агонь! — фашысты кінуліся наперад, потым уцямілі, адкуль вядзецца стральба, і развярнуліся шарэнгай да партызан.

— Агонь! — твары партызан гарэлі злосцю і нянавісцю. Яны не заўважалі, што карнікі пачалі страляць па схілу з буйнакаліберных кулямётаў. Фашысты набліжаліся. Вось першыя ўжо схаваліся за прыбярэжнымі кустамі. «Усё, — падумаў Турлук, — цяпер нам не ўтрымацца». І ў гэты момант разрыўная куля ўдарыла ў хваіну, за якой стаяў на калене камісар, прабіла яе навылет і... камісар пахіснуўся, але ўтрымаўся, прытрымліваючыся адной рукой за дрэва, павярнуўся да сваіх байцоў:

— Усім адыходзіць!

Партызаны ў гарачцы бою спачатку не падпарадкаваліся загаду.

— Заданне выканана! Я загадваю ўсім адыходзіць!

Турлук адчуваў, што губляе апошнія сілы. Адзін за другім змоўклі абодва партызанскія кулямёты, трэці быў разбіты яшчэ ў пачатку бою. Партызаны хуткімі перабежкамі кінуліся да лесу. З-за пакалечанай хвойкі яшчэ некаторы час чуліся стрэлы камісара. Потым усё змоўкла...



Толькі сабраўшыся разам, партызаны заўважылі, што Турлука няма сярод іх. Бой пачаўся а палове шостай гадзіны вечара. Колькі ён цягнуўся, ніхто не ведаў. Але цемра ўжо ахутала лес. Жывы камісар ці не? Можа, ляжыць ён пад хваіной, сыходзіць крывёю? Схадзіць у разведку вырашылі Мікола Дубясаў, Аляксандр Брамбеус і Барыс Іваноў.

Цішыня. Немцы чамусьці не адважыліся падыходзіць да хвойкі. Гаворка іх чулася ў вёсцы, на возеры, але на месцы бою было ціха. Хлопцы падпаўзлі да разбітага кулямёта, падабраліся да хваіны.

— Кроў!—усхваляваны шэпт Міколы молатам стукнуў у сэрцы партызан. Недалёка ад дрэва заўважылі яшчэ адну вялізную чырвоную пляму.

— Дакументы! — Мікола выцягнуў з-пад снегу і разявярнуў акрываўлены скрутак. А потым убачылі і Георгія Фёдаравіча. Камісар ляжаў, шырока раскінуўшы рукі...»

Юрый Аляксандравіч Брамбеус, грамадскі дырэктар мясцовага музея, змоўк, падышоў да старой таўшчэзнай хваіны:

— Глядзіце, да гэтага часу на ствале дрэва засталіся адметціны таго памятнага бою.— Ён пасвяціў ліхтарыкам.— Вось месца, дзе куля трапіла ў дрэва, — перайшоў на другі бок, зноў пасвяціў,—тут яна выйшла і напаткала грудзі камісара. Ён загінуў, але экспедыцыя карнікаў праваліласяя.




АДНАК былі ў нашым паходзе і іншыя размовы. Некалькі разоў мясцовыя жыхары самі прапаноўвалі расказаць аб гераічных падзеях таго часу. Адзін ветэран нават хацеў паказаць зямлянку, у якой жылі самыя першыя байцы партызанскага атрада Сяргея Майсеенкі. Але мы... адмовіліся. Чаму? Усё вельмі проста: маршрут наш быў так распрацаваны, што паход якраз падыходзіў пад першую катэгорыю складанасці, і любое адхіленне выбівала групу з намечанага графіка. Большасць жа ўдзельнікаў лічыла, што галоўнае — прайсці паход першай катэгорыі, які ў будучым дасць права ісці ў паходы другой і трэцяй катэгорый, таму не трэба губляць дарагі час на размовы і сустрэчы.

Як бачым, паход меў на ўвазе дзве мэты, інакш кажучы, мы імкнуліся злавіць «двух зайцаў». Але ўсім вядома, што гэтага зрабіць нельга, ведалі пра гэта і ўдзельнікі паходу. Таму і пагналіся... за кіламетрамі. Пагналіся, хаця асноўнай мэтай павінен быў стаць пошук герояў, адкрыццё невядомых імён людзей, якія аддалі сваё жыццё за незалежнасць Радзімы.

Чаму так здараецца? Віктар Бунта, камандзір нашага паходу, разважае так:

— Зорныя паходы па месцах баявой і працоўнай славы савецкага народа — гэта вельмі добрая і цікавая форма выхавання моладзі на прыкладзе старэйшых пакаленняў. Такія паходы даюць магчымасць бліжэй сутыкнуцца з гісторыяй, сваімі вачыма ўбачыць тых гераічных людзей.

Але што рабіць турыстам-спартсменам? Калі на зорны паход яшчэ неяк можна атрымаць дазвол у дэканаце, то пра спартыўны нават і не заікайся. Вось і выкручваюцца, хто як можа. Адзін са спосабаў — падганяць зорны паход пад якую-небудзь катэгорыю. Праўда, тады ад яго застаецца толькі адна назва, бо на пошук, на сустрэчы з ветэранамі не хапае часу.

Вяртаешся з такога паходу, і пачынаюцца творчыя пакуты: як напісаць справаздачу камітэту камсамола? Даводзіцца вышукваць факты з якой-небудзь літаратуры...



Вось так мяркуе чалавек, які не раз узначальваў зорныя паходы. Хто ж вінаваты ў гэтым? На маю думку, і камітэт камсамола, і турысцкі клуб універсітэта: няма паміж імі ніякага ўзаемадзеяння, падыходзяць яны да зорных і спартыўных паходаў з прахаладай. Таму і атрымліваецца, што паход адзін, а справаздачы—дзве. І нікому няма справы да таго, што адна з іх, магчыма, «ліпавая».

Як зрабіць, каб зорны паход быў сапраўды зорным, каб не адбываліся ў паходах такія дыялогі:

— Вы якой брыгадай цікавіцеся: адзінаццатай ці дваццаць пятай Хоцімскай? — стары лясснік, прыжмурыўшыся, глядзеў мне прама ў вочы.

— Ды мы... Мы проста падзеямі ваеннага часу...— не ведаў я, што адказаць, бо не было ў нас ніякага плана.

— Дык вы што, як школьнікі ідзеце?— стары ўсміхнуўся. — Ну, ну, ідзіце...

Вось так. Сумна, балюча, крыўдна.

А трэба, каб было інакш. Нам самім у першую чаргу трэба. Таму з планам, распрацаваным да паходу, павінен азнаёміцца камітэт камсамола. І толькі потым даваць дазвол на сам паход. Добра, калі б і пасля вяртання пацікавіліся: ці ўсё атрымалася, аб чым даведаліся, якія факты пацвердзіліся. Толькі ў такім выпадку зорныя паходы будуць сапраўды зорнымі.

**С. ПЛЫТКЕВІЧ,**
**спец. кар. газеты «Беларускі універсітэт», удзельнік паходу.**
Фота аўтара.

**НА ЗДЫМКАХ: як прыемна заўзятаму турысту яшчэ раз адчуць на сваіх плячах цяжар рэчмяшка! Удыхаеш чыстае паветра, глядзіш на велізарныя елкі, а пад нагамі дарога, якая вядзе ў нязведаныя мясціны: куды трэба павярнуць? Маршрут абмяркоўвае амаль уся група; шыльдачка на той самай хваіне, пад якой здзейсніў свой апошні подзвіг Г. Ф. Турлук; студэнт другога курса геафака Пётр Карловіч у паходзе ўпершыню; вось і Прывакзальная плошча Мінска. Апошні раз прысела на рэчмяшок Аксана Старычэнкава.**

# ЛІЧБЫ І ФАКТЫ

△ Ва універсітэце 12.007 чалавек з'яўляюцца членамі Добраахвотнага спартыўнага таварыства «Буравеснік».

△ Рознымі відамі спорту займаюцца 10.520 чалавек. 5.470 студэнтаў і супрацоўнікаў займаюцца ў спартыўных секцыях, з іх 715 — у секцыях спартыўнага ўдасканалення па 22 відах спорту.

△ Спартыўная база універсітэта налічвае: стадыёнаў — 2, футбольных палёў — 2, спартыўных залаў — 5, стралковых ціраў — 1, баскетбольных пляцовак — 2, валейбольных — 4, лыжных баз — 3, веласіпедных — 1, аздараўленча-спартыўных лагераў — 1.

△ На кафедры фізвыхавання і спорту працуе 55 выкладчыкаў, з іх кандыдатаў навук, дацэнтаў — 2, заслужаных трэнераў БССР — 3, майстроў спорту СССР міжнароднага класа — 3, майстроў спорту СССР — 22.

△ На VII Спартакіядзе народаў СССР універсітэт набраў усяго адно залікавае ачко. На VIII Спартакіядзе — 37,66 ачка, што прынесла чацвёртае месца сярод ВНУ рэспублікі пасля ІФК, БПІ і Гродзенскага універсітэта.

△ Шэсць спартсменаў універсітэта ўдзельнічалі ў спартакіядных спаборніцтвах. Другое месца заняў Камандар Маджыдаў (юрфак, 1 курс, класічная барацьба) — 30 ачкоў, шостае — Анатоль Парфіяновіч (супрацоўнік кафедры фізвыхавання і спорту, баскетбол) — 3,66 ачка, восьмае — Эльміра Харавец (журфак, 4 курс, шахматы) — 4 ачкі. У плаванні выступала Эла Ясюк (юрфак, 2 курс).

△ У 1981 годзе на спартакіядзе ВНУ рэспублікі універсітэт быў восьмым, у 1982 — шостым, у 1983 — трэцім.

△ На мінулай спартакіядзе ВНУ паспяхова выступілі зборныя каманды па класічнай барацьбе, валейболу (мужчыны і жанчыны), веласпорту, шахматах, мастацкай гімнастыцы, мнагабор'ю ГПА, лёгкай атлетыцы, футболу, баскетболу (мужчыны і жанчыны).

△ За справаздачны перыяд падрыхтаваны 1 майстар спорту СССР міжнароднага класа, 14 майстроў спорту СССР, 94 кандыдаты ў майстры спорту, 370 спартсменаў першага разраду. 7 тысяч 600 чалавек сталі значкістамі ГПА, 3200 — суддзямі, звыш трох тысяч набылі навыкі інструктараў па розных відах спорту.

△ У мінулым навучальным годзе паявіліся новыя формы спаборніцтваў: агляд-конкурс на лепшую спартыўную групу, турніры па стральбе і кросу на прызы Герояў Савецкага Саюза Д. П. Жмуроўскага і М. Я. Зайцава.

△ Звыш 7 тысяч чалавек прымае ўдзел у спартакіядзе універсітэта, звыш 3 тысяч — у спартакіядзе інтэрнатаў. Рэкорд належыць кубку першых курсаў па бегу на прыз газеты «Беларускі універсітэт». Сёлета на старт выйшаў 1321 студэнт. Васемнаццаць падраздзяленняў універсітэта ўдзельнічаюць у спартакіядзе супрацоўнікаў.

# КРОК НАПЕРАД

**Напярэдадні XIV справаздачна-выбарнай канферэнцыі спартыўнага клуба універсітэта наш карэспандэнт І. УЛАДЗІМІРАЎ сустрэўся са старшынёй праўлення спортклуба А. С. БАЛДЗІНЫМ.**

**— Анатоль Сяргеевіч, чым быў адметны гэты перыяд?**

— Трэба адзначыць, што ажывілася спартыўная работа на факультэтах. Паявіліся новыя прэтэндэнты на высокія месцы ў спартакіядзе і аглядзе-конкурсе. Калі ад факультэта радыёфізікі і электронікі мы маглі такога чакаць, то поспех факультэта журналістыкі — нечаканасць. Усе факультэты займалі прызавыя месцы ў спаборніцтвах спартакіяды, прычым галоўныя прызы дасталіся васьмі калектывам. Восем факультэтаў размеркавалі ўзнагароды і ў аглядзе-конкурсе. Гэта вельмі прыемна. Тым больш, што ў мінулым навучальным годзе універсітэт зноў «прабіўся» ў лік мацнейшых ВНУ рэспублікі па развіццю спорту.

**— Вынікі спартакіяды універсітэта вядомы шырокаму колу чытачоў нашай газеты. А вось ка аглядзе-конкурсе, думаецца, патрэбна спыніцца, бо ён павінен адлюстроўваць стан спартыўна-масавай работы на факультэтах.**

— Агляд-конкурс па спартыўна-масавай рабоце ставіць многа задач: паляпшэнне здароўя і ўсебаковае фізічнае развіццё студэнтаў на аснове комплексу ГПА, прыцягненне шырокіх колаў студэнтаў да заняткаў фізкультурай, арганізацыя іх адпачынку, павышэнне майстэрства спартсменаў. Ён уключае ў сябе наступныя раздзелы: спартакіяда, вучэбна-спартыўная, спартыўна-масавая, арганізацыйная работа, работа па комплексу ГПА, прапаганда спорту. Месцы размеркаваліся наступным чынам: 1 — юрфак, 2 — факультэт радыёфізікі і электронікі, 3 — журфак, 4 — фізфак, 5 — філфак, 6 — геафак, 7 — мехмат, 8 — хімфак, 9 — ФПМ, 10 — гістфак, 11 — біяфак.

**— Думаецца, што поспех пераможцаў невыпадковы?**

— Юрыдычны факультэт (намеснік дэкана па фізвыхаванню і спорту У. Фралоў, старшыня спортбюро М. Байкоўскі) другі раз запар заваяваў пераходны Чырвоны сцяг. Юрысты перамаглі ў спартакіядзе і ў рабоце па комплексу ГПА. Гэта не дзіўна — калектыў з'яўляецца лідэрам універсітэцкага спорту.

Факультэт радыёфізікі і электронікі (намеснік дэкана па фізвыхаванню і спорту В. Жукаў, старшыня спортбюро А. Кулінка) з сёмага месца перамясціўся на другое. Доўгі час ён прэтэндаваў на перамогу, але дабіцца яе не ўдалося. Цяпер факультэт зноў будзе змагацца за яе.

Самы вялікі скачок — у факультэта журналістыкі (намеснік дэкана па фізвыхаванню і спорту Л. Артамонава, былы старшыня спортбюро У. Абрамовіч). З апошняй ступенькі — на трэцюю. Рэзультат крыху здзіўляе, але калі знаёмішся са справамі, то бачыш заканамернасць: работа ў журналістаў была арганізавана добра.

Адзначым, што палепшылі свае вынікі фізічны і геаграфічны факультэты.

**— Але на гістфаку, біяфаку, ФПМ і мехмаце спартыўная работа пачынае кульгаць на абедзве нагі.**

— Мехмат і ФПМ сканцэнтравалі асноўную ўвагу на спартакіядзе, дзе занялі прызавыя месцы, а ў аглядзе-конкурсе пастулова здаюць пазіцыі. Слаба тут пастаўлена работа па правядзенню факультэцкіх спаборніцтваў, прапагандзе спорту, нават членскія ўзносы не сабраны. Такое становішча трэба выпраўляць.

Гістфак аказаўся на дзесятым месцы. Не хапае спортбюро арганізаванасці, настойлівасці, па ўсіх паказчыках факультэт знаходзіцца ў ліку апошніх.

Раней біялагічны факультэт быў у лідэрах, а апошнія чатыры гады ён не можа падняцца вышэй дзевятага месца. Цяпер ён не змог абагнаць нікога. Між тым, у біёлагаў ёсць добры стадыён. Чаму яны не возьмуць прыклад са сваіх суседзяў — радыефізікаў?

**— Анатоль Сяргеевіч, напэўна, выяўлены некаторыя праблемы развіцця спорту на факультэтах?**

— У некаторых калектывах мала праводзіцца спартыўных спаборніцтваў. Калі на факультэце радыёфізікі і электронікі ў стартах удзельнічала 33,4 працэнта студэнтаў, то на хімфаку, біяфаку, гістфаку гэты працэнт вельмі нізкі.

Мала праводзіцца турысцкіх паходаў, асабліва паходаў выхаднога дня. Толькі біяфак і журфак могуць пахваліцца імі. Некаторыя рашылі ў раздзеле работы па комплексу ГПА абмежавацца толькі падрыхтоўкай значкістаў, а спаборніцтваў па мнагабор'ю ГПА не праводзілі. Слабай застаецца і прапаганда спорту. Толькі на факультэце журналістыкі выпускаецца змястоўная спартыўная газета, якая з'яўляецца органам спортбюро. А што ў астатніх? Нізкая якасць матэрыялаў, дрэннае знешняе афармленне. Выспела неабходнасць праводзіць конкурс спартыўных газет. Мы мяркуем сумесна з рэдакцыяй газеты «Беларускі універсітэт» арганізаваць яго зімою. Ён з'явіцца добрым урокам для тых, хто займаецца выпускам насценгазет.

Патрэбна павышаць арганізаванасць у рабоце спортбюро. А то што атрымліваецца? Членскія ўзносы ДСТ «Буравеснік» своечасова здалі журфак, факультэт радыёфізікі і электронікі, філфак і геафак. А гістфак, мехмат, ФПМ і біяфак засталіся нават у даўгу.

**— Мы загаварылі аб арганізаванасці. Тут многае залежыць ад старшыні спортбюро, ад яго дзелавых якасцей.**

— Старшыня спортбюро — галоўная фігура ў спартыўным жыцці факультэта. Прыемна назваць прозвішчы лепшых. Гэта Міхаіл Байкоўскі (юрфак), Фёдар Палякшанаў (мехмат), Аляксандр Кулінка (факультэт радыёфізікі і электронікі), Уладзімір Абрамовіч (журфак), Аляксандр Вялікаселец (геафак), Віктар Анішчук (хімфак). Амаль усе яны засталіся ўзначальваць спортбюро і на бягучы год. Кожнага з іх вызначаюць дзелавыя якасці, адданасць спорту і свайму факультэту.

**— Несумненна, было б больш карысці, калі б спартыўным бюро аказвалі больш дапамогі грамадскія арганізацыі.**

— Камітэты камсамола, прафсаюзныя бюро факультэтаў не ў поўнай меры дапамагаюць нам. У прафбюро створаны спартыўна-аздараўленчыя камісіі, у задачу якіх уваходзіць і правядзенне спаборніцтваў, але гэты пункт не выконваецца. У камітэтах камсамола ёсць спартыўныя сектары, ад якіх карысці мала. Мінулай восенню камітэт камсамола універсітэта аб'явіў конкурс на лепшую спартыўную групу. А прасачыць за яго ходам не змог. У канцы вясенняга семестра старшыні спортбюро і выкладчыкі фізвыхавання наспех пісалі справаздачы, якія былі неаб'ектыўнымі. А дзе былі члены камітэтаў камсамола? Ці можа яны не ведалі аб конкурсе?

**— Паляпшэнне спартыўна-масавай работы на факультэтах і вяртанне універсітэта ў прызёры на спартакіядзе ВНУ рэспублікі ўзамазвязаны?**

— Зразумела. Палепшылася работа, напрыклад, на факультэце радыёфізікі і электронікі — і вось вынікі: калектыў заяўляе аб сабе ў спартакіядных спаборніцтвах. Так і ва універсітэце. За мінулы навучальны год падрыхтаваны чатыры майстры спорту, шаснаццаць кандыдатаў у майстры, тысячы разраднікаў, звыш дзвюх тысяч значкістаў ГПА. Добры прыклад росту спартыўнага майстэрства.

Зроблен крок наперад. Важна працягваць рух, не спыняцца на месцы, павышаць узровень работы. Асабліва гэта датычыцца новага саставу спартыўнага клуба.

## ВІНШУЕМ З перамогай

У СПАБОРНІЦТВАХ па спартыўнаму арыентаванню на кубак ВНУ рэспублікі ў эстафеце першае месца заняла зборная каманда нашага універсітэта, за якую выступалі І. Знак (геафак, 4 курс), Ф. Палякшанаў (мехмат, 5 курс) і В. Васілёнак (ФПМ, 2 курс). Віншуем з перамогай!

НЯДАЎНА завяршыліся спаборніцтвы па кросу сярод ВНУ вобласці. На перамогу прэтэндавалі моцныя каманды ІФК, БПІ, БТІ, БДІНГ. Першае месца ва ўпартай барацьбе заняла дружная зборная універсітэта. Так трымаць!

## РАЎНЕННЕ НА ПРАВАФЛАНГОВЫХ!



УЛАДЗІМІР СЯРГЕЕВІЧ ФРАЛОЎ сфатаграфаваны ў час правядзення кубка першых курсаў па бегу на прыз газеты «Беларускі універсітэт». Намеснік дэкана па фізвыхаванню і спорту юрыдычнага факультэта вельмі хваляваўся за сваіх падапечных, хацеў, каб яны перамаглі. Праўда, зрабіць гэта ім не ўдалося.

У. С. Фралоў — выпускнік юрфака, майстар спорту па класічнай барацьбе, цяжкай атлетыцы, парусінаму спорту. У 1979 годзе на VII Спартакіядзе народаў СССР ён заняў другое месца ў спаборніцтвах па парусінаму спорту.

Са спортам Уладзімір Сяргеевіч не расстаўся. Цяпер ён — старшы выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту, працуе на родным юрыдычным факультэце. Пад яго кіраўніцтвам юрфак тры гады запар выйграе спартакіяду і два — агляды-конкурсы.

— Няўдача ў кубку першых курсаў — часовая, — гаворыць ён. — Уся барацьба наперадзе.

Фота С. Плыткевіча.



БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

24 лістапада 1983 г.

Зак. 1993. АТ 04569.

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЁЎ